№ 99 (3840)

17 снежня 2013 г.
Выдаецца з ліпеня 1995 г.
на беларускай
і рускай мовах

Выдавец:
УП «Народная Воля».
Кошт — свабодны.

Народная Воля

На прастор, на шырокі разлог
Выходзі, мой народ, грамадою...

Якуб КОЛАС

Да ўвагі!
Хто хоча набываць газету ў офісе рэдакцыі — чакаем!

УВАГА!

28 снежня - апошні дзень падпіскі!

Так, менш за два тыдні засталося да заканчэння падпіскі на "Народную Волю" на першую палову 2014 года. Не спазніцеся, шаноўныя прыхільнікі вольнага слова.

Вашы бацькі маюць фінансавыя цяжкасці? Вы, іх дзеці, дапамажыце ім падпісацца на "Народную Волю".

Вы — бізнесмен, прадпрымальнік, у Вас неблагія даходы. Дапамажыце падпісацца на "Народную Волю" тым, хто не зводзіць канцы з канцамі.

Вы — лідар партыі, грамадскага руху, незалежнай прафсаюзнай суполкі. Зрабіце ўсё, каб як мага больш вашых сяброў трымалі ў руках "Народную Волю"!

Падпісныя індэксы "Народнай Волі":

для індывідуальных падпісчыкаў – 63222,

для арганізацый, устаноў, фірмаў – 632222.

Вы — з "Народнай Воляй", "Народная Воля" — з Вамі!



ЭКОНОМІКА

Валавы знешні доўг Беларусі дасягнуў 37 мільярдаў долараў



З пачатку года валавы знешні доўг Беларусі павялічыўся на 3 мільярды 332,2 мільёна долараў (амаль на 10 працэнтаў).

Валавы знешні доўг Беларусі ўяўляе сабой нявыплачаную суму фактычных бягучых і неабумоўленых абавязацельстваў, якая патрабуе выплаты асноўнага доўгу і/або працэнтаў дэбіторам у наступны перыяд часу і ўяўляе сабой абавязацельствы рэзідэнтаў Беларусі перад нерэзідэнтамі, нагадвае БелаПАН.

Валавы знешні доўг уключае ў сябе доўг органаў дзяржаўнага кіравання, органаў грашова-крэдытнага рэгулявання, банкаў і іншых сектараў эканомікі.

БОЛЬ

Сяргей ЗАКОННІКАЎ, паэт, лаўрэат Дзяржаўнай прэміі імя Янкі Купалы:



"...Выходжу на сталічны праспет Незалежнасці, завітваю ў буйныя гарады, райцэнтры і аграгарадкі, уключаю тэлевізар, слухаю радыё — амаль няма маёй роднай мовы, мовы карэннага этнасу. Дык урэшце — чые мы? Нашчадкі Вялікага Княства Літоўскага або Масковіі? Калі ж нешта зрушыцца ў галовах уладных манкуртаў і яны зразумеюць, што без рашэння нацыянальных праблем ніколі не пабудуеш вартую дзяржаву, што ўжо амаль да канца падсечана галіна, на якой усе мы — вярхі і нізы — сядзім? А затым можа быць і падзенне беларусаў ажно ў гістарычнае небыццё!"

("С.Н.")

ЭКСКЛЮЗІЎ

Бацька дыскваліфікаванага спартсмена: "Гэта помста нам!"

*Беларускі кідальнік молата, член нацыянальнай каманды па лёгкай атлетыцы **Андрэй Варанцоў** дыскваліфікаваны пажыццёва за выкарыстанне забароненых прэпаратаў. Яго бацька распавёў "Народнай Волі", што гэта "справа непразрыстая".*



Аб дыскваліфікацыі Андрэя Варанцова паведаміў афіцыйны сайт Нацыянальнага антыдопінгавага агенцтва Беларусі.

Дарэчы, бацька спартсмена — былы кідальнік молата, а зараз вядомы трэнер **Валерый Аляксеевіч ВАРАНЦОЎ**. Яго вучаніца **Аксана Мянькова** заваявала залаты медаль на Алімпійскіх гульнях-2008 у Пекіне.

— Допінг знайшлі ў пробе Андрэя, якую ўзялі яшчэ падчас чэмпіянату свету ў Фінляндыі ў 2005 годзе, — *кажа Валерый Аляксеевіч*. — Паўторную праверку праводзілі праз восем гадоў, уяўляеце?! Дадам, што ў 2005 годзе ўсё было нармальна, ніякага допінгу не знайшлі. Я лічу, што гэта помста нам, нашым спартсменам за тое, што беларускія кідальнікі молата Вадзім Дзевятоўскі і Іван Ціхан даказалі сваю невінаватасць пасля Гульняў у Пекіне. Вось зараз беларусаў і атакуюць...

— Будзеце абскарджваць рашэнне?

— А вы ведаеце, колькі трэба грошай, каб нешта абскардзіць? Не, няхай будзе так, як ёсць. Тым больш што сыну ўжо 37 гадоў, трэба заканчваць са спартыўнай кар'ерай. Ды і складана нешта даказаць. Хто ведае, што там здарылася з пробай за восем гадоў? Справа вельмі непразрыстая...

Алесь СІВЫ.

ЧУЛІ?

Трапілі пад турбіну

На Бярозаўскай ГРЭС адбыўся пуск новага энергаблока, праўда, пакуль у рабочым фармаце, без урачыстасцяў і пераразання чырвонай стужачкі. Але спецыялісты ведаюць сапраўдны кошт гэтай падзеі.

Скандал з новай турбінай для Бярозаўскай ГРЭС, якую не зрабілі і не паставілі своечасова, выйшаў на самы высокі ўзровень і каштаваў пасады многім.

На пачатку сакавіка Аляксандр Лукашэнка на пасяджэнні Савета міністраў заявіў, што *"з-за выбару незаможнага пастаўшчыка энергетычнага абсталявання фактычна сарвана рэалізацыя праекта мадэрнізацыі Бярозаўскай ГРЭС. Запланаваная на 2010 год пастаўка паравой турбіны і турбагенератара да гэтага часу не завершана ў поўным аб'ёме"*.

Пазней, у красавіку, падчас паслання Нацыянальнаму сходу Аляксандр Лукашэнка ўдакладніў: *"Сёння на камандзіроўкі патрацілі нямала мільярдаў рублёў, каб вымаліць гэтае абсталяванне, ездзяць па ўсёй матухне-Расіі выпрошваць гэтае абсталяванне"*.

Адразу пасля гэтага Следчы камітэт узбудзіў крымінальную справу па артыкуле "Службовая халатнасць". За правалы ў кіраванні энергетычнай галіной ужо ў красавіку былі звольнены міністр энергетыкі **Аляксандр Азярэц** *(на фота),* першы намеснік міністра **Эдуард Таўпянец,** а таксама гендырэктар "Белэнерга" Аляксей Шырма.



Дзе яны зараз?

Былы міністр энергетыкі **Аляксандр Азярэц** узначаліў аддзел аховы здароўя і бяспекі працы Беларускага прафсаюза работнікаў энергетыкі.

Першы намеснік міністра **Эдуард Таўпянец** стаў абвінавачаным, але ў жніўні гэтага года Следчы камітэт паведаміў, што *"крымінальная справа па абвінавачванні былога першага намесніка міністра энергетыкі Э.Ф.Таўпянца ў здзяйсненні злачынства, прадугледжанага ч.3 арт.426 КК, выдзелена ў асобную вытворчасць, папярэдняе расследаванне прыпынена і будзе працягнута пасля лячэння абвінавачанага"*.

Аляксей Шырма (дарэчы, унук праслаўленага музыканта Рыгора Шырмы), як даведалася "Народная Воля", з'ехаў з Беларусі. У жніўні гэтага года ён заняў пасаду генеральнага дырэктара ЗАТ "Малдаўская ГРЭС".

Што тычыцца крымінальнай справы, то яна яшчэ цягнецца. Абвінавачваюцца па ёй былы начальнік упраўлення матэрыяльна-тэхнічных рэсурсаў і вытворчай інфраструктуры ДВА "Белэнерга", які з'яўляўся старшынёй конкурсных камісій пры правядзенні таргоў па закупцы абсталявання для Бярозаўскай ГРЭС, і былы дырэктар ААТ "Белэнергаснабкамплект". Ім, як і **Эдуарду Таўпянцу,** у выніку было прад'яўлена абвінавачанне ў перавышэнні службовых паўнамоцтваў. Хаця ўсім зразумела, што не таго ўзроўню гэта былі таргі і не на тыя сумы кантракт, каб іх лёс вызначалі звычайныя клеркі.

Ігар МАРОЗАЎ.

ПАЗІЦЫЯ

Майдан — гэта штосьці большае

Майдан — гэта штосьці большае, чым супрацьстаянне апазіцыі і ўлады. Майдан — гэта штосьці большае, чым сутыкненне ўсходняй і заходняй думкі. Майдан — гэта нават не поле барацьбы розных ідэалогій, а тым больш не тая сфера, на якой не могуць падзяліць свае ўплывы Еўрасаюз і Расія. Майдан — гэта той Рубікон, да якога ў сваім жыцці даходзіць чалавек з думкай і перакананнем, што, каб застацца Чалавекам, трэба мяняць жыццё, грамадства, краіну.

Трэба, бо, калі не задумацца аб гэтым зараз, можна згубіць галоўнае, што мае чалавек, — сваю людскую годнасць. І тут два варыянты. Можна жыць, як набяжыць, нічога не мяняць і паціху дэградаваць. А можна ўсё ж такі зарызыкаваць і пайсці наперад. Туды, дзе няма ўпэўненасці, але ёсць надзея на перамены да лепшага, больш годнага, справядлівага і свабоднага жыцця.

Вячаслаў БАРОК, рыма-каталіцкі святар,
пробашч парафіі Святога Язафата Кунцэвіча ў Расонах.

З ПЕРШЫХ ВУСНАЎ

Святочны настрой рабочым не свеціць?

Пагаршэнне эканамічнага становішча на беларускіх прадпрыемствах стала асабліва прыкметным цягам апошніх двух месяцаў. Трывожныя навіны пра зніжэнне заробкаў і іх несвоечасовую выплату прыходзяць амаль штодня. "Амкадор-Белвар", "Гарызонт", МТЗ, МАЗ...

*"Народная Воля" папрасіла старшыню Беларускага кангрэса дэмакратычных прафсаюзаў **Аляксандра Ярашука** пракаментаваць гэтую сітуацыю.*

— Аляксандр Ільіч, у сённяшняй сітуацыі такія паняцці, як 13-я ці нават 14-я зарплата, могуць заняць сваё месца ў музеі працоўнай славы? Ці ўсё ж ёсць у рабочых хоць якая надзея на радаснае святкаванне Новага года?

— Думаю, што не тое што 13-ы ці 14-ы заробак, а нават і заробкаў за снежань нашым прадпрыемствам забяспечыць будзе цяжкавата. Крытычная сітуацыя больш наглядна і праяўляецца ў заробках. Да прыкладу, возьмем МАЗ. З гэтага прадпрыемства мы атрымліваем інфармацыю, як кажуць, з першых рук. Там ужо даўно размова ідзе пра выжыванне. Апошнім часам, напрыклад, быў скарочаны працоўны графік. Цяпер там працуюць толькі пад замову, бо нестае абаротных сродкаў. Тэрыторыя па-ранейшаму занята прадукцыяй.

І перспектыва застаецца даволі змрочнай. Нават тая падтрымка, якую аказвае Расія, не ў стане залатаць дзіркі, што ўтварыліся з-за татальнай неэфектыўнасці беларускай эканомікі. У выніку гэта вядзе да таго, што няма чым плаціць заробкі. Заробкі цягам года падвышаліся беспадстаўна, не забяспечваліся ростам прадукцыйнасці працы. І гэта я не толькі пра МАЗ гавару, такія праблемы характэрныя для ўсіх галін эканомікі. Значыць, можна зрабіць выснову, што крызіс мае сістэмны характар. І прагноз на перспектыву сумны, бо мадэрнізацыя сама па сабе ніяк не адбудзецца, калі не будзе інвестыцый, а інвестыцыі не будуць уліваца ў каманднаадміністрацыйную эканоміку.

Любоў ЛУНЁВА.

ВЯЛІКАЯ ПАЛІТЫКА

У Польшчы ўлада і апазіцыя паразмаўляюць пра Беларусь

Палітыкі плануюць сабрацца за "круглым сталом" на пачатку 2014 года.

Як паведамляе "Еўрарадыё" са спасылкай на польскія СМІ, з такой прапановай прэм'ер-міністр Польшчы **Дональд Туск** звярнуўся да прэзідэнта краіны **Браніслава Камароўскага**. На "круглым стале" павінна быць выпрацавана агульная пазіцыя асноўных партый па шэрагу пытанняў, у тым ліку і па міжнароднай палітыцы Польшчы ў дачыненні да Беларусі, Украіны і Расіі.

Штуршком да такой ініцыятывы стаў нядаўні "круглы стол" у Кіеве, на якім пра падзеі ў краіне размаўлялі ўкраінскі прэзідэнт і лідары апазіцыі.

«У справе Украіны, Беларусі, Расіі палякі і Польшча павінны гаварыць адным голасам. Дыскутуем, але павінны праводзіць адну палітыку», — заявіў Туск.

ВОПРОС ДНЯ

Лукашенко согласился освободить политзаключенных?

Беларусь готова на любые шаги для нормализации отношений с Евросоюзом. Об этом в понедельник заявил А.Лукашенко, принимая верительные грамоты послов иностранных государств.

Как известно, европейские политики неоднократно подчеркивали, что главным условием возобновления полноценного диалога с официальным Минском является освобождение и полная реабилитация всех политзаключенных. Значат ли последние высказывания, что Александр Лукашенко готов пойти на выполнение этого требования ЕС, мы скоро увидим.

ЗНАЙ НАШИХ!

В честь Азаренко в США назвали сорт роз

*Американская фирма из города Нэшвилл, специализирующаяся на выращивании и разведении цветов, назвала новый сорт роз в честь второй ракетки мира белоруски **Виктории Азаренко**.*



«Привет, Вика! Я работаю в компании по разведению цветов. Мы назвали один из сортов роз в твою честь — VA-VA VICTORIA», — написал в своем блоге в сети "Твиттер" **Бред Хантер.**

«Потрясающе!» — ответила Азаренко поклоннику.

СТОП-КРАН

Чаму забаранілі праваабарончы сайт?

Генпракуратурай на адрас праваабаронцы Валянціна Стэфановіча дасланы адказ на ягоны запыт аб уключэнні сайта www.spring96.org у спіс абмежаванага доступу.

Паводле дадзенага адказу, сайт ліквідаванай праваабарончай арганізацыі быў унесены ў спіс абмежаванага доступу паводле рашэння Генпракуратуры ў жніўні 2011 года ў сувязі з тым, што *«дзеянні ад імя Праваабарончага цэнтра «Вясна», якая не прайшла ў вызначаным парадку дзяржаўную рэгістрацыю, супярэчыць заканадаўству Рэспублікі Беларусь»*.

Генеральная пракуратура таксама нагадала, што за арганізацыю дзейнасці або ўдзел у дзейнасці арганізацыі, якія не прайшлі ва ўстаноўленым парадку дзяржаўную рэгістрацыю, арт.193.1 КК Рэспублікі Беларусь прадугледжана крымінальная адказнасць.

У сваю чаргу праваабаронцы кажуць: *«У сваёй дзейнасці «вясноўцы» заўсёды кіраваліся і кіруюцца палажэннямі Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь, а таксама міжнароднымі нормамі ў галіне правоў чалавека»*.

Яны адзначаюць: *«Рашэнне Вярхоўнага суда Рэспублікі Беларусь аб ліквідацыі Грамадскага аб'яднання «Праваабарончы цэнтр «Вясна» ў лістападзе 2003 года ў адпаведнасці з рашэннем Камітэта па правах чалавека ААН ад 7 жніўня 2007 г. №1296/2004 было прызнана парушэннем права на свабоду асацыяцый.*

ПАД ГРАДУСАМ

"Упрыгожым гэтую шэрасць сваімі ўсмешкамі!"



*Менавіта такую параду дае сіноптык **Дзмітрый Рабаў**, калі распавядае пра прагноз надвор'я на гэты тыдзень.*

— На гэтым тыдні будзе пераважаць павышаны для гэтага года тэмпературны рэжым, на 3—5 градусаў вышэй за норму, — *гаворыць сіноптык.* — Нас чакае аднатыпны характар надвор'я: мокры снег і дождж, сырое з туманамі і слабымі галалёднымі з'явамі надвор'е. Адзіны плюс, што актыўных цыклонаў і ўраганаў не чакаецца...

Вера ВІР.

УВАГА!

У крамах сеткі «Рублёўскі» выяўлены пратэрмінаваныя прадукты

*У кожным другім праверанымі магазіне выяўлены парушэнні ўмоў захоўвання прадуктаў харчавання. Пра гэта паведаміў карэспандэнту прэс- сакратар Міністэрства гандлю **Дзмітрый Маліноўскі**.*



Гандлёвая інспекцыя Мінгандлю правяла праверкі крам сеткі «Рублёўскі» на пачатку снежня. У выніку было ўстаноўлена, што ў кожным з 10 правераных гандлёвых аб'ектаў няправільна афармляліся цэннікі, у 80% выпадкаў — рэалізоўваўся тавар з мінулымі тэрмінамі прыдатнасці, у кожным другім аб'екце гандлю парушаліся ўмовы захоўвання прадуктаў харчавання.

Па ўсіх выяўленых фактах складзены пратаколы аб адміністрацыйных правапарушэннях.

«У адпаведнасці з дзеючым заканадаўствам на юрыдычныя асобы, якія працуюць пад гандлёвай маркай «Рублёўскі», могуць быць накладзены адміністрацыйныя штрафы на суму звыш 500 мільёнаў беларускіх рублёў", — цытуе belta.by Дзмітрыя Маліноўскага.

Як паведамлялася раней, гандлёвая інспекцыя ў жніўні—лістападзе бягучага года правяла шэраг пазапланавых праверак, у тым ліку некаторых крам сеткі «Еўраопт». Вынікі кантрольных мерапрыемстваў сведчаць, што ў кожным трэцім гандлёвым аб'екце сеткі магазінаў "Еўраопт" з ліку правераных рэалізоўваўся пратэрмінаваны тавар.

СЛЫШАЛИ?

Открытие «Чижовка-Арены» опять откладывается

Ввод в эксплуатацию многофункционального спортивного комплекса «Чижовка-Арена» состоится не ранее 25 декабря.

Строительство площадки, которая должна принять часть матчей чемпионата мира по хоккею 2014 года в Минске, сопровождается скандалами, связанными со злоупотреблениями ответственных лиц. В частности, в сентябре было возбуждено уголовное дело за хищение путем злоупотребления служебными полномочиями, совершенное в крупном размере, по которому четверо подозреваемых в хищении строительных материалов с данного объекта были задержаны.

Ледовую арену начали строить в 2009 году в целях подготовки белорусской столицы к чемпионату мира по хоккею-2014, напоминает interfax.by. Изначально ввод в эксплуатацию многофункционального спортивного комплекса был запланирован на середину 2011-го, затем сроки сдачи были перенесены на середину 2013 года. Но из-за нехватки рабочей силы открытие перенесли на 1 декабря, а теперь – уже на 25-е...

ПРОИСШЕСТВИЯ

Белорус избежал тюрьмы за поджог церкви в США

*Американский суд принял решение не отправлять в тюрьму белоруса **Александра Бычкова**, признанного виновным в поджоге церкви в городе Берлингтон (штат Вермонт).*

Вместо грозившего ему более чем десятилетнего тюремного заключения белоруса, по решению суда, ждет принудительная депортация на родину.

Американские прокуроры пошли на сделку с обвиняемым и согласились не добиваться для него лишения свободы в обмен на то, что он не будет сопротивляться депортации, сообщают местные СМИ. С таким решением согласились и лидеры общины церкви, с которыми говорили прокуроры. Депортации белорус будет дожидаться в федеральной тюрьме.

«Я хотел бы сказать, что мне очень жаль и что я заинтересован отправиться домой и там решать свои проблемы», — заявил на суде Александр Бычков, поблагодарив церковь за понимание своей ситуации.

По словам адвоката белоруса, его клиент за несколько недель до случившегося пытался получить психиатрическую помощь и постарается наладить свою жизнь уже на родине.


Безработный 32-летний иммигрант из Беларуси Александр Бычков обвинялся в поджоге и краже со взломом в связи с пожаром в колокольне конгрегационалистской церкви на Колледж-стрит в городе Берлингтон утром 23 октября. Задержавшим его полицейским он заявил, что «голоса приказали ему приехать в церковь и искать сокровища в колокольне».

Позднее сожженный белорусом шпиль церкви, который был признан опасным, снесли. Ущерб, нанесенный Александром Бычковым, оценивается в один миллион долларов.

НЕЛЬЗЯ МОЛЧАТЬ!

Мошенники в законе

В прошлом году я решил заказать встроенную мебель. Выбор пал на предприятие «Творец идей». Его директор С.В.Сушко произвел на меня хорошее впечатление. Приятно удивила его пунктуальность, предупредительность, отзывчивость: приехал для замера вместе с дизайнером в условленное время с точностью до минуты, внимательно выслушал и записал все пожелания. Через несколько дней по электронной почте мне прислали несколько вариантов дизайна. Кое-что меня не устраивало, но Сергей Владимирович попросил найти несколько часов и пообещал, что прямо в доме с дизайнером они сделают именно то, что требуется.



Место для марки

СУДЕБНАЯ ПОВЕСТКА
по гражданскому делу № 2 Л-33

Суд Сов-го р-на
Куда
Кому
вызывает Вас в качестве истца
к 10 00 часам «19» 07 2013 г.
по делу к ЧРСУП «Творец идей» о защите прав потребителей

Действительно, через несколько дней приехали, дружно потрудились, и в результате был предложен именно такой вариант кухни и горки, который меня устроил. Сушко подсчитал стоимость материалов, монтажных работ. Договорились о сроках. На фурнитуру, материалы по договору требовалась предоплата. 27 июля 2012 года подписали договор, я внес требуемый аванс и...

Сушко исчез! Правда, на телефонные звонки отвечал, извинялся, назначал новые сроки, обещал приехать, привезти все необходимое «в самое ближайшее время». В результате к дате окончания работ по договору, т.е. 15 сентября, частное ремонтно-строительное унитарное предприятие «Творец идей» по своим обязательствам работы так и не начинало.

Заподозрив неладное, я заглянул в интернет. На поисковые запросы «Творец идей» и «Сушко» на меня обрушился шквал информации!.. «Кидалово и моталово нервов по-сушковски», «Остерегайтесь «Творца идей!», «Сушко — мошенник и вор!», «Остановим Сушко всем миром!», «Беспредел ЧРСУП «Творец идей» и его директора Сушко С.В.» — это лишь некоторые из тем обсуждений его «методов работы» на форумах. Десятки потерпевших возмущены, разочарованы, предупреждают других, чтобы обходили стороной этого человека...

Схема действий Сушко всегда одинакова. При встрече умеет произвести приятное впечатление, убедить в профессионализме и надежности. Заключает договор и, как правило, кое-что начинает делать. Потом работы под разными предлогами прекращаются, и Сушко исчезает. На звонки не отвечает, а если дотошные заказчики его находят, извиняется, снова и снова обещает все сделать. Да так убедительно, что верят. В конечном итоге «кидает» не только заказчиков, но и «своих людей», которых нанимает выполнять ремонтно-строительные работы...

Оказалось, что «опыт общения» с милицией и судебными органами у него огромный. Никогда свою вину не отрицает, охотно признает все предъявляемые требования, обещает все сделать... И так до бесконечности. Например, до 2008 года Сушко работал как индивидуальный предприниматель. Уже тогда понял, что, прикрываясь гражданско-правовыми отношениями, можно успешно обманывать людей и не нести за это никакой ответственности. Усвоил, что можно не выполнять решения судов и никто тебя за это не накажет. Заключил договор, «кинул» заказчика, а деньги положил себе в карман! На одном из форумов я скачал любопытный документ «Перечень субъектов хозяйствования Республики Беларусь, в отношении которых составлены акты о невозможности исполнения исполнительных документов, начиная с 01 января 2008 года», в котором под №708 представлен ИП Сушко С.В. (УНП 190630496).

ЧРСУП «Творец идей» сейчас тоже на успешном пути к банкротству. Из информации в интернете узнал, что только по исполнительным документам судов ЧРСУП «Творец идей» уже задолжал более 100 миллионов рублей. А из имущества на балансе предприятия — только два стула. В штате всего один человек — директор. Согласно закону, если не хватает на предприятии средств для расчета по долгам, его учредитель несет ответственность личным имуществом. Но личного имущества-то у С.В.Сушко нет, все переписано на родственников. Ни государству, ни гражданам по своим долгам ничего не выплачивает и, похоже, не собирается. ЧРСУП «Творец идей» хозяйственную деятельность практически не ведет с начала нынешнего года.

Зато «почерк Сушко» успел проявиться и у других субъектов хозяйствования. Поскольку репутация у «ИП Сушко», ЧРСУП «Творца идей» благодаря интернету оказалась подпорченной, на форумах предупреждали, что Сушко работает уже как «Индивидуальный предприниматель Каштанова». Позже появились сообщения, что точно такие же методы работы у ООО «Стабилла-Декор», и "Глобал-строй", печати на документах которых ставит тот же Сушко.

2 ноября я направил С.В.Сушко «Предсудебное предупреждение», в котором потребовал расторгнуть договор и вернуть деньги. Реакции не последовало. Более того, когда я как-то в очередном телефонном разговоре неосторожно обмолвился, что, мол, буду записывать его слова на сотовый телефон, Сушко вообще перестал на звонки отвечать.

Поняв, что «влип», я решил действовать более решительно. От мошенников призваны нас защищать **ОРГАНЫ ПРАВОПОРЯДКА.** 29 января т.г. я написал в Партизанский РУВД Минска заявление, в котором изложил почти все вышеперечисленное, привел многочисленные факты, подтверждающие, что в действиях Сушко присутствуют обман, злоупотребление доверием, умысел на мошенническое завладение имуществом, изложил, что в основе «методов» его действий, как правило, одна и та же схема — использование гражданско-правовых отношений... Действует очень хитро. Чтобы создать иллюзию выполнения работ по гражданско-правовым договорам, обязательно хоть что-то сделает. И потом на все обвинения потерпевших, на опросы в милиции утверждает: «Я не отказываюсь. Пока не получилось. Но свои обязательства по договору выполню...» В заявлении были указаны контактные данные еще около десяти потерпевших.

К сожалению, надежды, что милиция выведет мошенника не чистую воду, не оправдались. Старший участковый инспектор Д.П.Бладыко, которому было поручено разобраться, меня даже не пригласил на беседу, не выслушал. Раздался как-то звонок на мой сотовый (с телефона Сушко!), и участковый сообщил, что Сушко находится у него. И передал ему трубку. Директор ЧРСУП «Творец идей» был краток: «Деньги привезу в воскресенье». С тех пор прошло почти десять месяцев, и он их до сих пор везет...

О методах рассмотрения таких дел в милиции очень хорошо написала в заявлении в прокуратуру Партизанского района на «Постановление об отказе в возбуждении уголовного дела» И.Ю.Оглоблина. Она очередная потерпевшая от мошеннических действий С.В.Сушко — уже управляющего ООО «Стабилла-Декор».

*«Участковый инспектор милиции УВД администрации Партизанского района г.Минска старший лейтенант милиции Н.С.Бондарь, занимающийся проверкой фактов по моему заявлению, никакую проверку не проводил. По собственной инициативе я выяснила, что **«Доследственная проверка включает: <u>получение, сбор дополнительной информации, ее накопление, анализ и оценку</u>»**.*

Н.С.Бондарь ограничился только опросом обвиняемого С.В.Сушко и конспектированием его показаний с последующей распечаткой текста. Никакого сбора дополнительной информации, ее накопления, а уж тем более анализа со стороны Н.С.Бондаря, а также подписавших Постановление сделано не было.

По многим вопросам мои показания и показания С.В.Сушко резко отличаются, и во всех случаях Бондарь верит исключительно Сушко.

Сушко показал, что в должности управляющего ООО «Стабилла-Декор» находится около десяти месяцев. В договоре 24/13 управляющей значится Н.П.Каштанова, а Сушко подписался как и.о. Управляющего «Стабилла-Декор».

Я позвонил Н.С.Бондарю по телефону, попытался выяснить, почему так поверхностно произведена проверка. «Это гражданско-правовые отношения, они не в компетенции участковых, — сказал Николай Сергеевич. — Экономическими преступлениями занимается ОБЭП. У них есть опыт и знания, чтобы установить состав правонарушения». Примерно такая же позиция и участкового Д.П.Бладыко, который занимался моим заявлением. Добавлю, что делами Сушко по заявлениям потерпевших занимались (или занимаются) почти все РУВД Минска. И все потерпевшие получали и получают из милиции «Постановления об отказе в возбуждении уголовного дела».

Поняв, что у Сушко «очень серьезная крыша» в милиции, решил искать правду в **ОРГАНАХ ПРАВОСУДИЯ**. 28 мая я отнес в суд Советского района г.Минска исковое заявление, которое помогли подготовить в Обществе защиты прав потребителей.

19 июля истец и ответчик по повестке явились в суд Советского района. Не было лишь судьи И.Е.Лавковой, поэтому заседание вела... молоденькая симпатичная девушка (к сожалению, она не представилась, поэтому ее должности и фамилии не знаю). После стандартных процедурных вопросов она начала вникать в курс дела. Я изложил подробности, сообщил, что Сушко все время обманывает, и не только меня, не выполняет решения судов... Сушко в ходе заседания подтвердил, что с начала нынешнего года ЧРСУП «Творец идей» практически не работает и на счету у него нет средств, чтобы рассчитаться по долгам. После чего был объявлен перерыв, и «молоденькая и симпатичная», видимо, поспешила за консультацией. Через полчаса вернулась и сообщила, что судебное заседание переносится. Выписала новые судебные повестки.

4 сентября судья И.Е.Лавкова на заседании суда присутствовала, зато ответчик не явился. Вопросы судья задавала чисто формальные, протокольные. Когда я и ей попытался рассказать, кто такой Сушко на самом деле, и легонько «заикнулся», что его называют на форумах в интернете не иначе как «кидалово и моталово», реакция у судьи была резкой. Она оборвала меня и запретила вообще что-либо плохое говорить об ответчике. Рассмотрение дела пошло тихо и спокойно, судья все уже знала и почти ничего не спрашивала.

В судебном решении мои требования по расторжению договора подряда были удовлетворены, суд обязал ответчика выплатить требуемую сумму, удовлетворил запрос на компенсацию морального вреда. Зато неустойка за невыполнение работ по ставке, установленной законом о защите прав потребителей, была уменьшена в... 25 раз! После получения по почте мотивировочной части решения я подал в установленные сроки кассационную жалобу. Судебной повестки из Минского городского суда пока не получил.

Кстати! Как-то случайно сравнил почерки на судебных повестках. Повестка, которая пришла мне по почте, была подписана секретарем суда Кибловой, и вторая, которую собственноручно после первого рассмотрения дела в суде написала «молоденькая и симпатичная», были по почерку на удивление похожи. А ведь вести судебные заседания секретарь не правомочна!

Предположим, Минский городской суд согласится с моими доводами и пересмотрит решение в части, на которую мной заявлено. Но даже в этом случае больших иллюзий на возврат задолженности по решению суда не питаю. Опыт Сушко по «выплате долгов» известен...

Здесь я вижу другую проблему. Как реально сегодня государство может обеспечить выполнение решений судов по взысканию денежных средств? Описать имущество, наложить на него арест, потом реализовать... Но этот вариант для законопослушных ответчиков — предприятий и граждан. А как быть с такими, как Сушко? Вот он специально все так подстроил, чтобы «ничего» у него не было! На автомобили деньги есть (не на себя их оформляет), детей на заграничные курорты отправляет, а дома — пусто. Придут описывать имущество, посмотрят, какой он «бедный и несчастный», глядишь, и пожалеют человечка, который «бестолковый, недалекий, бьется-бьется, а работать не научился» (мнение оперативников из Фрунзенского РУВД, которые разбирались с очередным заявлением потерпевших).

Еще лет пять назад в своем письме на имя тогдашнего Генерального прокурора Республики Беларусь Г.А.Василевича я обращал внимание на проблему взыскания долгов по решениям судов. Григорий Алексеевич тогда мне ответил, что и он тоже «за», что сам пытается что-то изменить, «но этому сопротивляются некоторые государственные органы».

А сегодня? Звоню в **НАЦИОНАЛЬНОЕ СОБРАНИЕ** председателю Постоянной комиссии по законодательству Л.С.Михальковой. Людмила Степановна, как оказалось, прекрасно осведомлена о существующей проблеме. «В первом чтении рассмотрен законопроект о введении административной ответственности за невыполнение решений судов, по которому предусмотрен арест до 15 суток, — сказала она. — Введение уголовной ответственности пока не предусмотрено. Примем этот законопроект, а там посмотрим, как будет работать».

Как-никак, а даже это радует! Сушко, конечно, 15 сутками административного ареста не напугаешь. Он с удовольствием отсидит и 30, лишь бы не выплачивать долги.

Прежде чем написать эту статью, мне пришлось глубоко вникнуть в тему мошенничества в гражданско-правовых отношениях. Как мне кажется, понял, «откуда растут ноги». Если милиция, Следственный комитет, суды не могут защитить своих граждан, быть может, проблему стоит донести до **ПРЕЗИДЕНТА**? Потерпевшие написали коллективное заявление на имя А.Г.Лукашенко. Притом не просто жаловались на формальный подход госорганов к рассмотрению заявлений, а изложили свое видение, чем вызвано растущее количество правонарушений в гражданско-правовых отношениях, предлагали пути решения проблемы.

19 апреля получили ответ из Администрации президента за подписью тогдашнего начальника главного управления по работе с обращениями граждан и юридических лиц С.И.Буко.

Не спорю, наверное, формально юридически прав был Станислав Иосифович. Зачем загружать главу государства всякими там «мелкими» проблемами? Но ведь не один же Сушко такой. По телевидению часто повторяются подобные сюжеты. В интернете полно разочарований деятельностью таких же юридических лиц и предпринимателей. Проблема есть, и сама она не исчезнет. Кроме того, в ст.10 пункт 5 Закона «Об обращениях граждан и юридических лиц» говорится, что «обращения, содержащие информацию о готовящемся, совершаемом или совершенном преступлении либо ином правонарушении, не позднее пяти дней направляются организациями, в которые они поступили, в соответствующие правоохранительные или другие государственные органы». Как бы был благодарен С.И.БукоДмитрий Михайловский, потерявший 13 тысяч у.е. от «работы» ООО «Стабилла-Декор», и многие другие, если б мошенника вовремя остановили!

Единственный государственный орган, который следует поблагодарить за принципиальность и последовательность, — это **ПРОКУРАТУРА**. Недавно, например, прокуратура Фрунзенского района **уже в третий раз (!)** отменила постановление Фрунзенского РУВД об отказе в возбуждении уголовного дела в отношении Сушко и направила материалы на новое расследование.

Надеемся, что закон в Республике Беларусь восторжествует!

Дмитрий ЛУПАЧ.

Минск.

ПРОДОЛЖЕНИЕ ТЕМЫ

Танцев не будет!

Чиновники Мингорисполкома дали ответ по поводу танцплощадки в парке Челюскинцев.

О том, как много народа собирается на летней танцплощадке в парке Челюскинцев, «Народная Воля» рассказывала несколько месяцев назад. Сюда приходят и те, кому слегка за 40, и тему, кому уже далеко за 90. И несколько часов от души пляшут под открытым небом. Но когда выпал снег, танцы в парке Челюскинцев прекратились. И любители потанцевать снова обратились в «Народную Волю».

— *Теперь мы вынуждены ездить на танцевальные вечера, которые устраивают в столичных домах культуры*, — рассказывает один из завсегдатаев танцплощадки в парке Челюскинцев **Михаил Тимошевич**. — *Не для всех это удобно, да и получается дороже, чем в парке Челюскинцев, а для пенсионеров ведь каждая тысяча рублей на счету! Мы просили чиновников, чтобы за ветеранами закрепили какую-то одну танцплощадку, и в качестве варианта предлагали обустроить для нас здание старой танцплощадки в парке Челюскинцев – все равно оно уже не первый год пустует. Ходили даже на прием к заместителю председателя Мингорисполкома **Игорю Карпенко**. Нас выслушали, пообещали помочь, но, к сожалению, ответ, который дали чиновники, не обрадовал.*

«В связи с прекращением инвестором дальнейшей реализации проекта по реконструкции танцевального зала и танцевальной веранды с эстрадно-концертным куполом в парке культуры и отдыха им. Челюскинцев, в Мингорисполкоме в настоящее время рассматривается вопрос о передаче этих объектов другому инвестору или вовлечению их в хозяйственный оборот с дальнейшей реконструкцией», — *говорится в письме за подписью начальника главного управления идеологической работы, культуры и по делам молодежи С.А.Хильмана.*

Чиновники также пообещали, что будут учитывать наше мнение «об улучшении организации досуга для всех возрастных категорий граждан Минска при определении дальнейшего функционального назначения этих объектов».

А я вот думаю: ну неужели ветераны и пенсионеры, о которых на словах так сильно заботятся чиновники, за всю жизнь не заслужили себе нормального места для танцев?..



Марина КОКТЫШ.

ЧУЛІ?

Штрафы для браканьераў вырастуць у разы

Напрыклад, штраф за незаконнае паляванне на цецерука павялічыцца ў 6 разоў!

Кіраўнік краіны падпісаў Указ №551, якім зацверджана новая рэдакцыя правіл вядзення паляўнічай гаспадаркі і палявання ў Беларусі і вызначаны штрафныя санкцыі для браканьераў (трэба дадаць, што дакумент пакуль яшчэ не ўступіў у сілу).

Як зменяцца штрафныя санкцыі?

Назва жывёлы (птушкі)	Штраф на гэты момант (у базавых велічынях)	Штраф у новай рэдакцыі
Дзік, алень	60	120
Лось	95	300
Алень высакародны	95	300
Атрад зайцападобных	10	20
Выдра рачная	45	100
Мядзведзь буры	95	400
Барсук	20	100
Бабёр рачны	70	70
Андатра	10	90
Глушэц	70	200
Цецярук	10	60
Шэры журавель	10	30



P.S. *Як паведаміў начальнік аддзела паляўнічай гаспадаркі Міністэрства лясной гаспадаркі Сяргей Шастакоў, пачатак сезона палявання на лася і аленя падчас гону перанесены з 1 верасня на 20 жніўня. Сезон загоннага палявання на капытных будзе заканчвацца 31 снежня, а не 30 снежня, як цяпер. Тэрмін заканчэння сезонаў палявання на бабра і выдру, андатру і норку амерыканскую падоўжаны з 1 сакавіка да 31 сакавіка. Тэрмін заканчэння сезона вясновага палявання на глушца і цецерука перанесены з 30 красавіка на 10 мая.*

Алесь СВЯТЛАНІЧ.

НЕ МОГУ МОЛЧАТЬ!

Требую отменить антинародное постановление

С августа этого года в Беларуси заработал новый порядок оплаты больничных листов, установленный постановлением Совета министров №569.



Мне пришлось вплотную соприкоснуться с этим постановлением, с лицемерием чиновников и даже, не побоюсь сказать, подлостью нынешней власти.

24.07.2013 г. я был госпитализирован в РНПЦ травматологии и ортопедии. 31.07.2013 г. мне повторно произвели ревизию тазобедренного сустава (первая операция была выполнена 29.11.2004 г.). После первой операции мне была присвоена III группа инвалидности бессрочно, больничный на частной фирме оплатили полностью и без проблем.

На этот раз через две недели после операции меня выписали под наблюдение в поликлинике №35 города Минска. Мне был продлен больничный лист, так как я должен был ходить на костылях в течение трех месяцев. Но 04.10.2013 г. я попал в БСМП в урологию с почечной коликой. Меня прооперировали, удалили камень из левой почки и 14.10.2013 г. выписали снова под наблюдение в поликлинике №35. Все это время продлеваемые больничные я сдавал через сотрудников на предприятие, и их мне оплачивали. Но когда я сдал последний больничный на 35 календарных дней, мне позвонили из бухгалтерии и сказали, что, согласно новому положению, мне оплатят половину больничных дней, то есть из 120 — 60 дней, так как я инвалид III группы и после 60 дней болезни мне нужно оформлять инвалидность и получать пособие по инвалидности.

Но простите, я же инвалид III группы *бессрочно,* уже почти десять лет. Пособие по инвалидности не получаю с июля 2010 года, когда мне исполнилось 60 лет и я стал пенсионером по возрасту. А если бы я не был инвалидом, а просто пенсионером — мне оплатили бы больничный полностью? Теперь получается, что больничный лист, выданный Минздравом за время, которое я честно проболел, могу просто выбросить. Хочу добавить, что мне еще «повезло», так как будучи на больничном, я попал в БСМП с заболеванием почки, и это засчиталось как перерыв в болезни. Потому что первая госпитализация была связана с заболеванием опорно-двигательного аппарата. Может быть, мне оплатят 90 дней нахождения на бюллетене. Но в любом случае 30 дней точно не оплатят.

Как можно расценить такую оплату больничных листов? Я считаю, что это грубое нарушение моих прав как инвалида, пенсионера, трудящегося человека. Это не что иное, как стремление обобрать человека в нашем разрекламированном властью «социальном государстве». Я призываю Федерацию профсоюзов немедленно выступить с требованием отменить это антинародное постановление. И это должны быть не просто слова, а конкретные действия.

Александр АНАСОВИЧ, работник ОАО «Интеграл».
Минск.

МЫСЛИ ВСЛУХ

В новый год — без хамства и показухи!

Согласитесь, что почти каждого из нас больше всего интересуют цены на коммунальные услуги, основные продукты питания и лекарства, курсы валют. Как говорят французы, такова жизнь.

И с каждым днем цены нас больше огорчают, чем радуют. Особенно беспокойный в этом смысле выдался уходящий 2013 год. За электроэнергию и газоснабжение мы теперь платим по так называемым социально справедливым тарифам... Хотелось бы спросить: это ж для кого они социально справедливые? Убежден, что только для министров и депутатов, а не для пенсионеров-инвалидов. Потому что многие пенсионеры, заплатив за коммуналку, думают, как свести концы с концами...

Или вот еще один пример того, как не до конца продуманные решения нашего правительства отравляют нашу и без того нерадостную жизнь!

Министерство образования не считает *«целесообразным приравнивать опекунские и приемные семьи, воспитывающие трех и более детей, к многодетным»...* Чем думает этот министр? Господин министр, матерям, которые растят таких детей и дают им путевку в жизнь, нужно низко кланяться и целовать их заботливые руки!

Лично у меня нет сомнения в том, что в новом году нужно все эти проблемы, выражаясь простым языком, поставить с головы на ноги. Думаю, что не открою большой тайны, если скажу: многие проблемы у нас в стране от того, что чиновники считают, будто народ им должен, а не они ему. Задумайтесь: уже сколько лет правительство предлагает нам «планов громадье», что мне порой напоминает рецепты брежневской идеологической похлебки. Прямо скажу: уже не верю, что все уверения, обещания и прогнозы наших чиновников имеют под собой реальную базу. А вы?..

Впрочем, хватит о грустном. Новый год на пороге. От всей души желаю, чтобы в 2014 году глупость, подлость, хамство и показуха обошли нас стороной, чтобы для каждого год был удачным. Будьте здоровы и счастливы! Желаю читателям «Народной Воли» и ее сотрудникам здоровья, удачи и любви! С Новым годом!

С уважением —
Юрий ЯСИНСКИЙ, ветеран труда и спорта, инвалид 2-й группы.

РУБАМ

Чаму мы прыехалі ў Расію?

Так здарылася па волі лёсу, што мой брат Лявон яшчэ на пачатку 60-х гадоў мінулага стагоддзя апынуўся ў адной з найпрыгажэйшых мясцін Украіны — Закарпацці, пусціў там свае карані. У яго нарадзіліся дзеці ад гуцулкі-прыгажуні, пайшла чарада ўнукаў і праўнукаў. А не так даўно брат вырашыў прывезці праўнучку, 13-гадовую Зоську, на радзіму сваіх продкаў — Пружаншчыну, каб пазнаёміць яе, так бы мовіць, з родавым сямейным гняздом.

Дык вось Зоська аніяк не магла зразумець: чаму яны ехалі ў Беларусь, а трапілі... у Расію? Бо на радзіме яе прадзеда ўсе размаўлялі чамусьці па-руску, і надпісы паўсюль таксама не па-беларуску. Не сунімалася яна, калі мы прыйшлі ў Пружанскую бібліятэку, якая носіць імя вядомага на Брэстчыне паэта Міколы Зосіма (сваяка нашага роду). Зоська нават па-даросламу абурылася, не верачы, што ўсё-такі знаходзіцца ў Беларусі. На шыльдзе ж бібліятэкі значыцца імя змагара за вольную Беларусь, а на паліцах — не больш за тры-чатыры дзясяткі беларускіх кніжак...

Каб адказаць на пытанні праўнучкі-ўкраінкі, мой брат Лявон паклікаў на дапамогу мяне. Я ж спытаўся ў дзяўчынкі, ці ведае яна значэнне слова ***калонія.*** Яна сказала, што пра каланіялізм ужо вучыла ў школе, назвала нават некалькі краін — колішніх калоній... Я ж мусіў патлумачыць тое, чаго яны, канечне, “не праходзілі” — дарэчы, як і беларускія дзеці. А менавіта: нашы землі, пачынаючы з канца XVIII стагоддзя (па сутнасці, і па сённяшні дзень) з’яўляюцца калоніяй Расійскай імперыі — незалежна ад змен у назвах краін і ў дзяржаўна-палітычным ладзе. З тае далёкае пары ўсё нацыянальнае — і сімволіка, і мова, і літаратура, і навучанне, і сам беларускі дух — няўхільна і жорстка выкаранялася і выкараняецца. Аб тым сведчыць і маленькі прыклад перад вачыма — падбор кніжак у Пружанскай бібліятэцы.

А дзяўчынка цікавілася: “Чаму ж тады беларусы не змагаюцца супраць каланіялізму?” Змагаюцца, адказваў я, толькі самыя мужныя, самаахвярныя. Больш за тое, вякі рабства сталі, на жаль, для беларусаў звыклым існаваннем, псіхалогіяй, спосабам мыслення і ўчынкаў. І гэта — пачварная, жудасная рэальнасць, у якой нармальнаму чалавеку немагчыма дыхаць.

Калі Зоська са сваім прадзедам — маім братам — ад’язджала дадому ва Украіну, дык плакала: ёй было вельмі шкада беларусаў. Абяцала вывучыць беларускую мову, каб было больш тых, хто яе любіць і шануе. А я падарыў ёй трылогію Васіля Якавенкі “Пакутны век”, якую пашчасціла мне ў свой час набыць, — з надзеяй, што ўкраінская дзяўчынка прачытае яе па-беларуску...

Радуюся за праўнучку брата: яна жыве і будзе жыць у сапраўды вольнай Украіне, бо там жыве адданы Радзіме народ. Яе, нашу сястру, як бы ні гнулі нястомныя ў сквапнасці “старэйшыя браты”, ніколі не сагнуць. Украінцы гэтага не хочуць! Аб тым гавораць і падзеі апошняга часу.

...А нашы беларускія дзеці, як і іх бацькі, будуць пакорліва вучыцца ў рускіх школах па падручніках на расійскі — імперскі — лад. І нічога ў нас не зменіцца, калі самі беларусы не ачомаюцца, не зразумеюць: трэба браць курс на вяртанне сваёй страчанай Айчыны! А рабства было пракляццем і ганьбай нават у старажытнасці, не тое што ў XXI стагоддзі...

Мікола КАНАХОВІЧ, афіцэр у адстаўцы.
г.Пружаны.

КАЛОНКА АЛЕСЯ НЯЎВЕСЯ

А ў мінулыя часы самі ткалі паясы

З-за недахопу рабочых рук ТАА “Баранавіцкае вытворчае баваўняна-папяровае аб’яднанне” плануе запрасіць ткачых з Бангладэш.

І тчэ, забыўшыся, рука
Заміж персідскага узора
Цвяток радзімы васілька.
М. Багдановіч, “Слуцкія ткачыхі”

Мы не хаваем сёння пыхі,
Што ў старадаўнія часы
Былі ў нас слуцкія ткачыхі,
Іх залатыя паясы.
На паясах узор дзівосны,
І цешыць вока ён... Але ж
У нас садзіцьмуцца за кросны
Цяпер ткачыхі з Бангладэш.
А час мінецца некаторы,
І ткацьме нечая рука
На паясах чужыя ўзоры
Заместа кветкі-васілька...

“Не тое” слова? Чытай нанова!

Мытны камітэт вырашыў правесці паўторную экспертызу кніг праваабаронцы Алеся Бяляцкага “Асьвечаныя Беларушчынай”. Раней Ашмянская мытня канфіскавала іх, бо “кніга можа нанесці страты іміджу Рэспублікі Беларусь”.

На мытні ў нас заўжды праблемы,
І гэта, мусіць, не сакрэт:
“Не той” альбом вязуць нацдэмы,
Правозяць стос “не тых” газет.
Такі ж эксцэс і ў раз чарговы:
Арыштавалі многа кніг,
Бо ў іх, маўляў, “не тыя” словы,
Дадаткам жа — і “не пра тых”.
І паднялі нацдэмы вэрхал —
Як і заўжды, само сабой.
Няўзнак ці па адмашцы “зверху”,
Але адбыўся нейкі збой.
Хоць і не выспеў час “адлігі”,
Не адмянілі кайданоў,
Аднак жа мытня тыя кнігі
Перачытаць рашыла зноў.
І мо прачытанае змусіць
Падумаць мытню “галавой”
І ў рэшце рэшт аб Беларусі
Папоўніць трохі досвед свой.

З нядаўніх пор паўсюль тэрор

Перад гульнёй апошняга тура чэмпіянату краіны паміж “Мінскам” і “Дняпром” АМАП прапускаў на поле футбалістаў праз металашукальнікі...

Час у нас цяпер імглісты,
Бы вайна ў наш край прыйшла,
І паўсюдна тэрарысты
Пазіраюць з-за вугла.
Калі, скажам, Бацька едзе
Па шашы ці па лыжні,
Дык шукай паблізу недзе
Міліцэйскія гайні.
Пра вайну дарэчы згадкі —
Сапраўды як на вайне:
Ну а раптам хто з рагаткі
Ці з драбавіка пульне?
І паўсюль блішчаць пагоны —
Ці сяржант, ці генерал:
Бацька ў людзі — і кардоны
Правяраюць на метал.
Дый не толькі справа ў Бацьку.
Генералаў з блізкіх пор
(У метро падклалі “цацку”)
Душаць думкі пра тэрор.
З-за таго, што два вар’яты
У грамадства ўбілі клін,
Мы для іх у будні й святы
Тэрарысты як адзін.
Памутнеў, няйначай, розум,
Ці няма мазгоў ані:
Футбалісты, бач, пагрозу
Могуць несці пры гульні.
Прасвяціць-прабіць павінны
Іх дэтэктар навылёт:
Ці не ёсць у буцах міны,
А ў трусах — гранатамёт?
* * *
Небяспечна на футболе
(Гэтак смешна — хоць заплач),
Бо яны ганяць па полі
Могуць бомбу, а не мяч...

СЛУЧАЙ

«Я есть хочу»

Уважаемая редакция!

Хочу рассказать про один случай.

Недавно в 8.30 вечера — звонок в квартиру. Открываю. Стоит прилично одетый человек среднего возраста и говорит: «Может быть, вы меня покормите? Я очень есть хочу». Я говорю, что у меня, пенсионера, только на себя хватает. Но потом я его все же покормил.

И это не анекдот, поверьте. Это наша жизнь. Я знал, что меня могут убить и обокрасть. Но не побоялся, покормил...

О каких же достижениях трезвонят государственные СМИ, если голодают люди?..

В.А.СТЕПАНИЩЕВ, пенсионер.
Витебск.

ОТ РЕДАКЦИИ

Есть письма, которые требуют комментариев. То, о чем поведал читатель В.А.Степанищев, вызывает ряд вопросов. Почему «прилично одетый человек среднего возраста» голодает? Кто он? Какая у него судьба?

Если он не инвалид, то в наше время заработать на еду — не проблема. Если нетрудоспособен, то таких должно поддерживать государство.

Зарабатывает, но до копейки пропивает? И, случается, ходит с протянутой рукой? Подобных типов — множество.

Уважаемый В.А.Степанищев! Ваше письмо наводит на размышления и более широкого плана. Если Вам удастся увидеть того, кого Вы «не побоялись покормить», то поинтересуйтесь этим человеком более основательно, а вдруг вырисуется очень интересная история? А пока публикуем Ваше письмо исходя лишь из одного соображения — о редком случае Вы рассказали.



З НАТУРЫ

ЧОРНЫ КАШАЛЁК



На аўтастанцыі ў гэты кірмашовы дзень было шматлюдна. Большая частка пасажыраў ехала да недалёкіх вёсак, а пажылая Зоя Кружэлька аж да самага Гродна: з вялікімі сумкамі прадуктаў накіроўвалася да сына. Сама б і не данесла такога цяжару, але муж Вінцук адпрасіўся з работы і падвёз на ровары.

— Глядзі ты! — здзівіўся ён. — Народу столькі, што ў аўтобус будзе не ўбіцца.

— Нічога, не перажывай, уваб’юся. Вунь, бачыш, ён стаіць на пляцоўцы, што воддаль ад пасадачных. І дзверы якраз адчынены, улезу раней за іншых. Там ужо нехта сядзіць, то і я сяду! — Зоя рашуча накіравалася да аўтобуса.

Вінцук дапамог занесці сумкі ў салон, кінуў вокам на маладую прывабную пасажырку, што сядзела на першым месцы і чытала нейкі часопіс.

— Вядро з яйкамі трэба паставіць на сядзенне, што ты яго ў праходзе кінуў?! Тут жа разаб’юць.

— Сама стаў куды хочаш, а я паехаў.

— Як прыйдзеш на абед, то не забудзься даць курам вады, а то ўжо недзе ўсю выпілі!

Зоя хацела яшчэ нешта сказаць, але Вінцук ужо сеў на ровар і паехаў. Успомніўшы пра ваду, яна падумала, што нічога не ўзяла з сабой папіць. У дарозе, можа, піць захочацца, то не купляць жа ў якім буфеце на прыпынку, толькі грошы марнаваць, а яна трэслася над кожнай капейкай.

У што набраць — не знайшлося, і Зоя вырашыла папіць хоць нехаця, у запас. Яна падазрона зірнула на суседку-пасажырку: каб чаго не скрала — і выйшла з салона.

Калі вярталася з вадапою, то ўбачыла, што да аўтобуса ўжо ідзе вадзіцель. Не паспела ступіць на першую прыступку, як пачула яго гнеўны голас:

— А гэта яшчэ што?! Чаму на сядзенні стаіць вядро? Яно ваша?!

— А чыё ж яшчэ, канешне, маё. Вось да сына ў Гродна еду, яйкі вязу і яшчэ шмат чаго.

— Мне ўсё роўна, куды вы едзеце і што везяце. Чаму паставілі вядро на сядзенне? Каб чахлы парваць? І наогул, чаго вы залезлі ў аўтобус раней часу? Я зараз пад’еду на пасадачную пляцоўку.

— А яна чаго тут сядзіць? — гнеўна зірнула Зоя на пасажырку.

— Яна наш кантралёр і едзе ў Гродна па службовых справах. Ды што я тут перад вамі апраўдваюся. Забірайце свае хатулі — і марш з аўтобуса на пасадачную пляцоўку!

— Не пайду, хоць міліцыю выклікай!

— У вас, можа, яшчэ і білета няма?

— Няма, як жа! Усё ў мяне ёсць, — Зоя палезла ў сумку, дзе павінен быў ляжаць чорны кашалёк з грашыма і білетам: пашукала-памацала — кашалька не было. Твар яе стаў чырвоны, як савецкі сцяг, потым белы, як снег Антарктыды. Набраўшы поўныя грудзі паветра, выпаліла на адным дыханні:

